ПАРЛАМЕНТ-
Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь

ПАРЛАМЕНТ-
Национальное собрание Республики Беларусь

ПАРЛАМЕНТ-
Национальное собрание Республики Беларусь

МИНСК, 1997

ПАРЛАМЕНТ-
Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь

МІНСК, 1997

Пад агульнай рэдакцыяй
Старшынь палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
Малафеева А.А. і Шыпука П.У.

Над кнігай працавалі:
Сечка Л.Н. (кіраўнік аўтарскага калектыва),
Лапша І.М., Вярцінскі А.Э., Галабурда М.Ц.

Пры выкарыстанні тэкставага і фотаілюстрацыйнага матэрыялаў спасылка на гэтае выданне абавязкова.

© Фонд падтрымкі парламентарызму

ЗМЕСТ

7 **Уводзіны**
Введение
Introduction

8 **Парламент - Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь**
27 *Парламент - Национальное собрание Республики Беларусь*
46 *Parliament - National Assembly of the Republic of Belarus*

69 **Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Кароткія біяграфічныя нарысы**
Депутаты Палаты представителей. Краткие биографические очерки
Deputies of the House of Representatives: Curricula Vitae

180 **Члены Савета Рэспублікі. Кароткія біяграфічныя нарысы**
Члены Совета Республики. Краткие биографические очерки
Members of the Council of Republic: Curricula Vitae

244 **Склад Савета Палаты прадстаўнікоў**
Состав Совета Палаты представителей
Composition of the Council of the House of Representatives

245 **Склад Прэзідыума Савета Рэспублікі**
Состав Президиума Совета Республики
Composition of the Presidium of the Council of Republic

246 **Склад пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў**
Состав постоянных комиссий Палаты представителей
Composition of Permanent Commissions of the House of Representatives

252 **Склад пастаянных камісій Савета Рэспублікі**
Состав постоянных комиссий Совета Республики
Composition of Permanent Commissions of the Council of Republic

256 **Прадстаўніцтва дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі ў міжпарламенцкіх структурах**
Представительство депутатов Палаты представителей и членов Совета Республики в межпарламентских структурах
Representation of Deputies of the House of Representatives and Members of the Council of Republic in Inter-parliamentary Structures

267 Спіс дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў
Список депутатов Палаты представителей
List of Deputies of the House of Representatives

271 Спіс членаў Савета Рэспублікі
Список членов Совета Республики
List of Members of the Council of Republic

274 Сакратарыяты палат Нацыянальнага сходу
Секретариаты палат Национального собрания
Secretariats of the National Assembly's Houses

УВОДЗІНЫ

У студзені 1997 года дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сабраліся на свае першыя пасяджэнні. У нашай краіне пачаў работу Парламент — Нацыянальны сход — прадстаўнічы і заканадаўчы орган, створаны ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь 1994 года са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада 1996 года.

Правільна зразумець сутнасць і перспектывы гэтага важнейшага для айчыннай дзяржаўнасці працэсу дапаможа больш блізкае знаёмства з прадстаўнічым і заканадаўчым органам краіны.

Важна ведаць, што дзве галоўныя функцыі любога сучаснага парламента — прадстаўніцтва і заканадаўства — разнародныя і ў прынцыпе не абавязкова ўтвараюць устойлівы сінтэз. Аднак імкненне да арганічнага спалучэння прадстаўніцтва і заканадаўства ў парламенце — інстытуце, які адыгрывае важнейшую ролю ў падзеле ўлады, несумненна, адно з істотных набыткаў палітычнай тэорыі і практыкі.

Увесь адносна небагаты вопыт беларускага парламентарызму сведчыць аб тым, што разумны баланс палітычных сіл у Парламенце садзейнічае найбольш поўнаму авалоданню механізмамі ўзгаднення і праходжання законапраектаў, асаблівасцямі рэгулявання розных бакоў жыцця грамадства, разуменню прыярытэтнасці ў прыняцці законаў, іх якасці, паўнаты, несупярэчлівасці і рэалізаванасці.

У працэсе развіцця парламентарызму ўзнікае яшчэ адна важная з'ява — стварэнне прафесійнага палітычнага класа. Бясспрэчна, цэнтрам яго крышталізацыі з'яўляецца Нацыянальны сход. Іменна ў сценах Парламента ствараецца той рэсурс палітычнага прафесіяналізму, які ў значнай меры вызначае палітычную сучаснасць і будучыню Беларусі.

Прапануемая чытачам кніга аб Нацыянальным сходзе Беларусі прадаўжае традыцыю, пачатак якой быў пакладзены намнога раней выданнем кніг, прысвечаных заканадаўчай галіне ўлады. Яна ўнясе свой уклад у фарміраванне інфармацыйнага ўзаемадзеяння грамадства і ўлады, што ў канчатковым выніку будзе садзейнічаць развіццю парламентарызму ў Беларусі і ўмацаванню яе дзяржаўнасці.

ПАРЛАМЕНТ - НАЦЫЯНАЛЬНЫ СХОД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Структура Парламента, парадак выбрання і фарміравання яго палат

Парламент — Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь з'яўляецца двухпалатным прадстаўнічым і заканадаўчым органам Рэспублікі Беларусь.

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь складаецца са 110 дэпутатаў, якія выбіраюцца на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага, прамога выбарчага права пры тайным галасаванні. У адпаведнасці з Канстытуцыяй права вылучэння кандыдатаў у дэпутаты належыць грамадскім аб'яднанням, працоўным калектывам і грамадзянам Рэспублікі Беларусь. Кандыдатам у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў мае права быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 21 года.

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь была сфарміравана ў лістападзе 1996 года з ліку дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь XIII склікання, абраных у 1995 годзе па аднамандатных акругах з выкарыстаннем мажарытарнай выбарчай сістэмы.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва і складаецца з 64 членаў. Парадак фарміравання Савета Рэспублікі спалучае элементы выбарнасці і назначэння. Восем членаў Савета Рэспублікі назначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, а астатнія выбіраюцца на аснове роўнага, ускоснага выбарчага права пры тайным галасаванні па восем членаў Савета Рэспублікі ад кожнай вобласці і горада Мінска на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню кожнай вобласці і горада Мінска. Вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі ажыццяўляецца на сумесных пасяджэннях прэзідыумаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню і адпаведных выканаўчых камітэтаў. Рашэнне сумеснага пасяджэння па дадзенаму пытанню прымаецца шляхам кансэнсусу. Выбраным членам Савета Рэспублікі лічыцца кандыдат, які атрымаў па выніках галасавання больш паловы галасоў ад колькасці дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню (горада Мінска), якія прынялі ўдзел у галасаванні. Членам Савета Рэспублікі можа быць грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які дасягнуў 30 гадоў і пражыў на тэрыторыі адпаведнай вобласці, горада Мінска не менш пяці гадоў.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь выбары новага складу палат Парламента назначаюцца не пазней чатырох месяцаў і праводзяцца не пазней 30 дзён да сканчэння паўнамоцтваў палат дзеючага склікання. Першая пасля выбараў сесія палат Парламента склікаецца Цэнтральнай

камісіяй па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў і пачынае сваю работу не пазней чым праз 30 дзён пасля выбараў.

Датэрміновае спыненне паўнамоцтваў палат Парламента

Тэрмін паўнамоцтваў Парламента — чатыры гады. У той жа час Канстытуцыя абумоўлівае магчымасць, умовы, а таксама парадак датэрміновага спынення паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў і (або) Савета Рэспублікі. Па рашэнню Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь паўнамоцтвы Палаты прадстаўнікоў могуць быць спынены ў выпадках адмовы Палатай прадстаўнікоў у даверы Ураду, выказвання вотуму недаверу Ураду ці двухразовай адмовы ў дачы згоды на назначэнне Прэм'ер-міністра. Паўнамоцтвы Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі могуць быць таксама датэрмінова спынены на падставе заключэння Канстытуцыйнага Суда ў выпадку сістэматычнага або грубага парушэння Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Рашэнні па гэтых пытаннях прымае Прэзідэнт не пазней чым у двухмесячны тэрмін пасля афіцыйных кансультацый са старшынямі палат.

Палаты не могуць быць распушчаны ў перыяд надзвычайнага або ваеннага становішча, у апошнія шэсць месяцаў паўнамоцтваў Прэзідэнта, у перыяд вырашэння палатамі пытання аб датэрміновым вызваленні або зняцці Прэзідэнта з пасады. Не дапускаецца таксама роспуск палат на працягу года з дня іх першых пасяджэнняў. Нечарговыя выбары палат Парламента праводзяцца на працягу трох месяцаў з дня датэрміновага спынення паўнамоцтваў палат Парламента.

Статус дэпутата Палаты прадстаўнікоў і члена Савета Рэспублікі

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў ажыццяўляюць свае паўнамоцтвы ў Парламенце на прафесійнай аснове, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй. Дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў не могуць быць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, суддзі. Не дапускаецца таксама сумяшчэнне мандата дэпутата Палаты прадстаўнікоў з мандатам дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў. У той жа час Канстытуцыя дазваляе сумяшчэнне мандата дэпутата Палаты прадстаўнікоў з пасадай члена Урада.

Членамі Савета Рэспублікі не могуць быць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, члены Урада, суддзі.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі карыстаюцца недатыкальнасцю пры выказванні сваіх думак і ажыццяўленні сваіх паўнамоцтваў, за выключэннем выпадкаў абвінавачання ў паклёпе і знявазе. На працягу ўсяго тэрміну сваіх паўнамоцтваў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі могуць быць арыштаваны, іншым чынам пазбаўлены асабістай свабоды толькі з папярэдняй згоды адпаведнай палаты, за выключэннем выпадкаў учынення дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства, а таксама затрымання на месцы злачынства.

Крымінальная справа ў адносінах да дэпутата Палаты прадстаўнікоў або члена Савета Рэспублікі разглядаецца Вярхоўным Судом Рэспублікі Беларусь.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі карыстаюцца правам рашаючага голасу па ўсіх пытаннях, якія разглядаюцца ў адпаведных палатах Нацыянальнага сходу. Яны таксама маюць права выбіраць і быць выбранымі ў органы палат Нацыянальнага сходу, прапаноўваць пытанні для разгляду палатамі Парламента, уносіць прапановы і заўвагі па парадку дня, парадку разгляду і сутнасці абмяркоўваемых пытанняў, уносіць прапановы і выказваць думку па персанальнаму складу ўтвараемых палатамі Парламента органаў і кандыдатурах службовых асоб, якія выбіраюцца, назначаюцца або зацвярджаюцца палатамі Парламента. Дэпутаты маюць права ўдзельнічаць у спрэчках, звяртацца з запытамі, задаваць пытанні, даваць даведкі, даводзіць да ведама парламентарыяў свой пункт гледжання і пункт гледжання выбаршчыкаў, выконваць іншыя функцыі, прадугледжаныя Канстытуцыяй і рэгламентамі палат Нацыянальнага сходу. У адрозненне ад дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў у адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь члены Савета Рэспублікі правам заканадаўчай ініцыятывы не валодаюць.

У мэтах найбольш эфектыўнага выканання сваіх функцый дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі надзелены правам звяртацца з запытам да Прэм'ер-міністра, членаў Урада, кіраўнікоў дзяржаўных органаў, што ўтвараюцца або выбіраюцца Парламентам. Адказ на запыт павінен быць дадзены на працягу дваццаці сесіённых дзён.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў для калектыўнага абмеркавання і выказвання думак па законапраектах і іншых пытаннях, якія адносяцца да ведання Палаты прадстаўнікоў, па рэалізацыі перадвыбарных праграм маюць права аб'ядноўвацца ў пастаянныя ці часовыя дэпутацкія групы. Дэпутацкая група ўтвараецца пры наяўнасці не менш дзесяці дэпутатаў, якія жадаюць увайсці ў яе склад. Дэпутаты могуць свабодна ўваходзіць і выходзіць з дэпутацкіх груп і не звязаны іх рашэннямі ў сваёй дэпутацкай дзейнасці.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў адказны за свае дзеянні перад

выбаршчыкамі. Згодна з Канстытуцыяй ён можа быць адкліканы выбаршчыкамі па падставах, прадугледжаных законам. Галасаванне аб адкліканні дэпутата праводзіцца ў парадку, прадугледжаным для выбрання дэпутата, па ініцыятыве не менш дваццаці працэнтаў грамадзян, якія валодаюць выбарчым правам і пражываюць на адпаведнай тэрыторыі.

Асноўныя функцыі Парламента — Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

У цэлым Парламент Рэспублікі Беларусь, таксама як парламенты большасці краін свету, выконвае наступныя асноўныя функцыі:

1) прыняцце законапраектаў;

2) зацвярджэнне дзяржаўнага бюджэту;

3) удзел у фарміраванні органаў выканаўчай і судовай улады;

4) выкананне кантрольнай функцыі;

5) ажыццяўленне квазісудовых функцый;

6) знешнепалітычная функцыя.

Паколькі Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь прадугледжвае двухпалатную структуру Парламента, то вышэйпералічаныя функцыі размяркоўваюцца паміж палатамі Парламента.

Згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь Палата прадстаўнікоў ажыццяўляе наступныя віды дзейнасці:

1) разглядае па прапанове Прэзідэнта ці па ініцыятыве не менш як 150 тысяч грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць выбарчым правам, праекты законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, аб тлумачэнні Канстытуцыі;

2) разглядае праекты законаў, у тым ліку аб зацвярджэнні асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь; ваеннай дактрыны; ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў; аб асноўным змесце і прынцыпах ажыццяўлення правоў, свабод і абавязкаў грамадзян; аб грамадзянстве, статусе іншаземцаў і асоб без грамадзянства; аб правах нацыянальных меншасцей; аб зацвярджэнні рэспубліканскага бюджэту і справаздачы аб яго выкананні; устанаўленні рэспубліканскіх падаткаў і збораў; аб прынцыпах ажыццяўлення адносін уласнасці; аб асновах сацыяльнай абароны; аб прынцыпах рэгулявання працы і занятасці; аб шлюбе, сям'і, дзяцінстве, мацярынстве, бацькоўстве, выхаванні, адукацыі, культуры і ахове здароў'я; аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў; аб вызначэнні парадку вырашэння пытанняў адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржавы; аб мясцовым самакіраванні;

аб судаўладкаванні, судаводстве і статусе суддзяў; аб крымінальнай адказнасці; аб амністыі; аб абвяшчэнні вайны і заключэнні міру; аб прававым рэжыме ваеннага і надзвычайнага становішча; аб устанаўленні дзяржаўных узнагарод; аб тлумачэнні законаў;

3) назначае выбары Прэзідэнта;

4) дае згоду Прэзідэнту на назначэнне Прэм'ер-міністра;

5) заслухоўвае даклад Прэм'ер-міністра аб праграме дзейнасці Урада і адабрае або адхіляе праграму; паўторнае адхіленне палатай праграмы азначае выказванне вотуму недаверу Ураду;

6) разглядае па ініцыятыве Прэм'ер-міністра пытанне аб даверы Ураду;

7) па ініцыятыве не менш як адной трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў выказвае вотум недаверу Ураду; пытанне аб адказнасці Урада не можа быць пастаўлена на працягу года пасля адабрэння праграмы яго дзейнасці;

8) прымае адстаўку Прэзідэнта;

9) выстаўляе большасцю галасоў ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў абвінавачанне супраць Прэзідэнта ва ўчыненні дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства; на падставе адпаведнага рашэння Савета Рэспублікі прымае большасцю не менш як дзве трэці галасоў ад поўнага складу рашэнне аб зняцці Прэзідэнта з пасады;

10) адмяняе распараджэнні Старшыні Палаты прадстаўнікоў.

Палата прадстаўнікоў можа прымаць рашэнні па іншых пытаннях, калі гэта прадугледжана Канстытуцыяй.

Савет Рэспублікі:

1) адабрае або адхіляе прынятыя Палатай прадстаўнікоў праекты законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю; аб тлумачэнні Канстытуцыі; праекты іншых законаў;

2) дае згоду на назначэнне Прэзідэнтам Старшыні Канстытуцыйнага Суда, Старшыні і суддзяў Вярхоўнага Суда, Старшыні і суддзяў Вышэйшага Гаспадарчага Суда, Старшыні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў, Генеральнага пракурора, Старшыні і членаў Праўлення Нацыянальнага банка;

3) выбірае шэсць суддзяў Канстытуцыйнага Суда;

4) выбірае шэсць членаў Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў;

5) адмяняе рашэнні мясцовых Саветаў дэпутатаў, якія не адпавядаюць заканадаўству;

6) прымае рашэнне аб роспуску мясцовага Савета дэпутатаў у выпадку

сістэматычнага і грубага парушэння ім патрабаванняў заканадаўства і ў іншых выпадках, прадугледжаных законам;

7) разглядае выстаўленае Палатай прадстаўнікоў абвінавачанне супраць Прэзідэнта ва ўчыненні дзяржаўнай здрады або іншага цяжкага злачынства, прымае рашэнне аб яго расследаванні. Пры наяўнасці падстаў большасцю не менш як дзвюма трацямі галасоў ад поўнага складу прымае рашэнне аб зняцці Прэзідэнта з пасады;

8) разглядае ўказы Прэзідэнта аб увядзенні надзвычайнага становішча, ваеннага становішча, поўнай або частковай мабілізацыі і не пазней як у трохдзённы тэрмін пасля іх унясення прымае адпаведнае рашэнне.

Савет Рэспублікі можа прымаць рашэнні па іншых пытаннях, калі гэта прадугледжана Канстытуцыяй.

Службовыя асобы і органы палат Парламента — Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Старшыні палат

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі выбіраюць са свайго складу адпаведна Старшыню Палаты прадстаўнікоў і яго намесніка і Старшыню Савета Рэспублікі і яго намесніка.

Кандыдатуры на пасаду Старшыні Палаты прадстаўнікоў маюць права вылучаць Савет Палаты прадстаўнікоў, пастаянныя камісіі Палаты прадстаўнікоў, дэпутацкія групы і дэпутаты. У спісы для тайнага галасавання ўносяцца ўсе вылучаныя кандыдатуры, за выключэннем тых, хто заявіў аб самаадводзе. Кандыдаты на пасаду Старшыні Палаты прадстаўнікоў і яго намесніка лічацца выбранымі, калі ў выніку галасавання яны атрымалі больш паловы галасоў ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў.

Аналагічная працэдура прадугледжана для выбрання Старшыні Савета Рэспублікі і яго намесніка. Адрозненне заключаецца толькі ў тым, што правам на вылучэнне Старшыні Савета Рэспублікі валодаюць толькі члены Савета Рэспублікі. Кожны член Савета Рэспублікі мае права прапанаваць па адной кандыдатуры на пасады Старшыні Савета Рэспублікі і яго намесніка.

Кампетэнцыя Старшыні Палаты прадстаўнікоў і Старшыні Савета Рэспублікі ўстаноўлена адпаведнымі рэгламентамі палат.

Старшыня Савета Рэспублікі і Старшыня Палаты прадстаўнікоў у рамках адпаведнай палаты:

ведае ўнутраным распарадкам палаты;

вядзе пасяджэнні сесіі палаты, ажыццяўляе іншыя паўнамоцтвы ў ходзе правядзення пасяджэнняў;

падпісвае пастановы палаты;

накіроўвае для разгляду ў пастаянныя камісіі палаты праекты законаў;

прадстаўляе палату ва ўзаемаадносінах з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, другой палатай Парламента, Урадам Рэспублікі Беларусь і іншымі дзяржаўнымі органамі, а таксама грамадскімі аб'яднаннямі, службовымі асобамі і парламентамі замежных дзяржаў, міжнароднымі парламенцкімі арганізацыямі;

вырашае іншыя пытанні арганізацыі дзейнасці палаты ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і адпаведным рэгламентам.

Да спецыфічных функцый Старшыні Савета Рэспублікі адносяцца:

даручэнне пастаянным камісіям распрацоўкі законапраектаў, якія мяркуецца ўнесці ў Палату прадстаўнікоў у якасці заканадаўчай ініцыятывы Савета Рэспублікі;

накіраванне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь для падпісання законаў, прынятых Палатай прадстаўнікоў і адобраных Саветам Рэспублікі.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў або яго намеснік зацвярджаюць сваім подпісам аўтэнтычнасць прынятага Палатай прадстаўнікоў праекта закона, які перадаецца на разгляд Савета Рэспублікі.

Старшыня Савета Рэспублікі і Старшыня Палаты прадстаўнікоў маюць права выдаваць распараджэнні распарадчага і кантрольнага характару па пытаннях, аднесеных да іх кампетэнцыі.

Савет Палаты прадстаўнікоў і Прэзідыум Савета Рэспублікі

Для арганізацыі работы палат, іх камісій, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі, папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі пытанняў, якія адносяцца да ведання палат Парламента, рэгламентамі Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі прадугледжваецца стварэнне Савета Палаты прадстаўнікоў (далей — Савет) і Прэзідыума Савета Рэспублікі (далей — Прэзідыум).

Савет і Прэзідыум з'яўляюцца пастаянна дзеючымі органамі палат і падсправаздачныя адпаведна Палаце прадстаўнікоў і Савету Рэспублікі.

У склад Савета ўваходзяць Старшыня Палаты прадстаўнікоў, яго намеснік, старшыні пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў і Начальнік Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

У склад Прэзідыума ўваходзяць Старшыня Савета Рэспублікі, яго намеснік, старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі.

У функцыі Савета і Прэзідыума ўваходзяць адпаведна:

арганізацыя работы па падрыхтоўцы сесій;

падрыхтоўка праектаў парадку дня сесій палат;

інфармаванне дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі аб мяркуемым парадку дня сесіі;

кантроль за падрыхтоўкай і прадстаўленнем дэпутатам Палаты прадстаўнікоў і членам Савета Рэспублікі законапраектаў, неабходных дакументаў і матэрыялаў;

прыняцце мер для забеспячэння прысутнасці дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі на сесіі;

каардынацыя работы пастаянных камісій і іншых органаў палат;

інфармаванне дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі аб сваіх пасяджэннях;

у выпадку неабходнасці ўнясенне прапановы аб стварэнні пастаянных і часовых камісій палат;

дача даручэнняў пастаянным камісіям і іншым органам палат;

ажыццяўленне кантролю за своечасовым разглядам і рэалізацыяй дзяржаўнымі і грамадскімі органамі, службовымі асобамі прапаноў і заўваг дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, членаў Савета Рэспублікі, выказаных на сесіях палат, за дзейнасцю па запытах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі;

ажыццяўленне іншых функцый, прадугледжаных рэгламентамі палат.

Да функцый Савета Палаты прадстаўнікоў адносяцца таксама такія спецыфічныя функцыі, як:

стварэнне ў выпадку неабходнасці пры Савеце Палаты прадстаўнікоў рабочых груп;

зацвярджэнне планаў і праграм падрыхтоўкі праектаў заканадаўчых актаў і іншых пытанняў, якія падлягаюць разгляду Палатай прадстаўнікоў у бягучым годзе і ў перспектыве;

прыняцце рашэнняў аб стварэнні часовых творчых калектываў і іх фінансаванні для распрацоўкі праектаў законаў і іншых актаў Палаты прадстаўнікоў, аб падрыхтоўцы неабходных аналітычных матэрыялаў, правядзенні экспертыз законапраектаў;

ажыццяўленне каардынацыі дзейнасці і агульнае кіраўніцтва органамі, прызначанымі для інфармацыйнага, навуковага і арганізацыйна-тэхнічнага забеспячэння Палаты прадстаўнікоў пры ажыццяўленні ёю сваіх паўнамоцтваў.

Пастаянныя камісіі Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі

Для вядзення законапраектнай работы, папярэдняга разгляду і падрыхтоўкі пытанняў, якія адносяцца да ведання палат, а таксама ажыццяўлення кантрольных

паўнамоцтваў палаты выбіраюць пастаянныя камісіі. Пастаянныя камісіі з'яўляюцца пастаянна дзеючымі органамі палат. У іх склад уваходзяць старшыня камісіі, намеснікі старшыні і члены камісіі. Члены пастаянных камісій выбіраюцца большасцю галасоў ад поўнага складу палат адкрытым галасаваннем, калі палатай не будзе прынята іншае рашэнне. Старшыня пастаяннай камісіі выбіраецца тайным галасаваннем большасцю ад поўнага складу палаты. Член Савета Рэспублікі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў можа быць членам толькі адной пастаяннай камісіі. У склад пастаянных камісій не могуць быць выбраны старшыні палат, а таксама іх намеснікі.

Часовы рэгламент Савета Рэспублікі прадугледжвае выбранне пяці пастаянных камісій Савета Рэспублікі: па заканадаўству і дзяржаўнаму будаўніцтву; па эканоміцы, бюджэту і фінансах; па сацыяльных пытаннях; па рэгіянальнай палітыцы; па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Больш за тое, Рэгламент раскрывае кола пытанняў, якія ўваходзяць у кампетэнцыю кожнай з камісій Савета Рэспублікі.

Часовы рэгламент Палаты прадстаўнікоў не прадугледжвае дакладнага пераліку пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў і не вызначае кола іх кампетэнцыі. Пералік і склад пастаянных камісій павінны зацвярджацца большасцю галасоў ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў.

У адпаведнасці з Пастановай Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад 17 снежня 1996 года "Аб утварэнні пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь" былі ўтвораны наступныя пастаянныя камісіі Палаты прадстаўнікоў: Камісія па заканадаўству; Камісія па нацыянальнай бяспецы; Камісія па пытаннях эканомікі; Камісія па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту; Камісія па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанню; Камісія па бюджэту і фінансах; Камісія па аграрных пытаннях; Камісія па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічнаму прагрэсу; Камісія па працы, сацыяльных пытаннях, ахове здароўя, фізічнай культуры і спорту; Камісія па правах чалавека і нацыянальных адносінах; Камісія па міжнародных справах і сувязях з СНД.

У адпаведнасці з часовымі рэгламентамі пры неабходнасці палаты могуць таксама ствараць следчыя, рэвізійныя і іншыя часовыя камісіі. Часовыя камісіі ў сваёй дзейнасці падсправаздачныя палатам Парламента.

Парламенцкая працэдура

Работа Парламента — Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў сесіённым парадку. Палаты збіраюцца на дзве чарговыя сесіі ў год: пер-

шая сесія адкрываецца 2 кастрычніка, і яе працягласць не павінна быць больш як 80 дзён; другая сесія адкрываецца 2 красавіка, і яе працягласць не можа быць больш як 90 дзён.

У выпадку асаблівай неабходнасці на падставе ўказа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі склікаюцца на нечарговую сесію. Нечарговыя сесіі склікаюцца па вызначанаму парадку дня па ініцыятыве Прэзідэнта ці па патрабаванню большасці не менш як дзве трэці галасоў ад поўнага складу кожнай з палат.

Пасяджэнні палат, як правіла, з'яўляюцца адкрытымі. Палаты, калі гэтага патрабуюць інтарэсы дзяржавы, могуць прыняць рашэнне аб правядзенні закрытага пасяджэння большасцю галасоў ад іх поўнага складу. Пасяджэнне кожнай палаты лічыцца правамоцным пры ўмове, што на ім прысутнічае не менш як дзве трэці дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў або членаў Савета Рэспублікі ад поўнага складу кожнай палаты. Адно пасяджэнне ў месяц рэзервуецца для пытанняў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі і адказаў Урада.

Парадак правядзення спрэчак у палатах рэгулюецца іх рэгламентамі. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі маюць права выступаць толькі пасля прадастаўлення ім слова старшынствуючымі на пасяджэннях палат. Як дэпутат Палаты прадстаўнікоў, так і член Савета Рэспублікі можа выступіць па аднаму і таму ж пытанню не больш двух разоў. Часавыя рамкі выступленняў у палатах Парламента неаднолькавыя. Так, час для дакладаў на пасяджэннях Палаты прадстаўнікоў прадастаўляецца, як правіла, у межах да адной гадзіны, для садакладаў — да 20 мінут. Выступаючым у спрэчках даецца да 10 мінут, для паўторных выступленняў, а таксама выступленняў пры паартыкульным абмеркаванні праектаў законаў — да 5 мінут, для выступленняў па парадку вядзення, матывах галасавання, для заяў, унясення пытанняў, прапаноў, паведамленняў і даведак — да 3 мінут.

У Савеце Рэспублікі суадносіны некалькі іншыя: час для дакладаў — у межах 30 мінут, для садакладаў — 15 мінут. Выступаючым у спрэчках таксама прадастаўляецца 10 мінут; для паўторных выступленняў у спрэчках, а таксама выступленняў пры абмеркаванні праектаў законаў — да 5 мінут; для выступленняў па кандыдатурах, парадку вядзення пасяджэння, матывах галасавання, для заяў, унясення запытаў, пытанняў, прапаноў, паведамленняў і даведак — да 3 мінут. Як у Палаце прадстаўнікоў, так і ў Савеце Рэспублікі па рашэнню, прынятаму большасцю ўдзельнікаў пасяджэння палат, старшынствуючы мае права прадоўжыць час для выступленняў, але не больш чым на палову ад устаноўленага рэгламентамі. У час пасяджэнняў, у тым ліку і закрытых, Прэзідэнт, яго прадстаўнікі, Прэм'ер-міністр і члены Урада могуць выступаць па-за чаргой запісаўшыхся для

выступленняў столькі разоў, колькі яны запатрабуюць.

Выступаючыя на пасяджэннях палат Парламента не павінны выкарыстоўваць у сваёй мове грубыя і некарэктныя выразы, заклікаць да незаконных і гвалтоўных дзеянняў, адхіляцца ад абмяркоўваемай тэмы. У гэтым выпадку старшынствуючы на пасяджэнні палаты пасля другога папярэджання мае права пазбавіць выступаючага слова.

Спыненне спрэчак праводзіцца па рашэнню палат.

Галасаванне ў Палаце прадстаўнікоў і ў Савеце Рэспублікі адкрытае і ажыццяўляецца асабіста дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, членам Савета Рэспублікі шляхам падачы голасу "за" або "супраць". Тайнае галасаванне праводзіцца толькі пры вырашэнні кадравых пытанняў. Рэгламентамі палат прадугледжваецца магчымасць правядзення пайменнага галасавання дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў або членамі Савета Рэспублікі. Вынікі пайменнага галасавання прыводзяцца ў стэнаграфічных справаздачах пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі і могуць быць апублікаваны ў сродках масавай інфармацыі.

Рашэнні Палаты прадстаўнікоў прымаюцца ў форме законаў і пастаноў. Рашэнні Савета Рэспублікі прымаюцца ў форме пастаноў.

Рашэнні палат Парламента лічацца прынятымі пры ўмове, што за іх прагаласавала большасць ад поўнага складу палат, калі іншае не прадугледжана Канстытуцыяй. Кваліфікаваная большасць у дзве трэці галасоў ад поўнага складу палат Парламента патрабуецца для прыняцця: Канстытуцыі, законаў аб унясенні ў яе змяненняў і дапаўненняў, аб увядзенні ў дзеянне ўказаных законаў, актаў аб тлумачэнні Канстытуцыі; праграмных законаў аб асноўных напрамках унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, аб ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь; рашэння аб адмене часовых дэкрэтаў Прэзідэнта, якія маюць сілу закона; рашэння аб знятці Прэзідэнта з пасады; для пераадолення вета Прэзідэнта на прыняты закон або яго часткі. Канстытуцыя прадугледжвае таксама неабходнасць кваліфікаванай большасці галасоў Палаты прадстаўнікоў у выпадку, калі Савет Рэспублікі адхіліў прыняты Палатай прадстаўнікоў законапраект, а пагаджальнай камісіі абедзвюх палат Парламента не ўдалося прыняць узгоднены тэкст законапраекта. У такіх выпадках Прэзідэнт ці па яго даручэнню Урад маюць права запатрабаваць, каб Палата прадстаўнікоў прыняла канчатковае рашэнне. Законапраект лічыцца прынятым Палатай прадстаўнікоў пры ўмове, што за яго прагаласавала не менш як дзве трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў.

Працэдура прыняцця законаў

Заканадаўчая ініцыятыва

Заканадаўчы працэс у Рэспубліцы Беларусь пачынаецца з моманту ўнясення праекта закона на разгляд Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Правам заканадаўчай ініцыятывы ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь валодаюць Прэзідэнт, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, Урад, а таксама грамадзяне, якія валодаюць выбарчым правам, у колькасці не менш як 50 тысяч чалавек. Законапраекты аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, а таксама праекты актаў тлумачэння канстытуцыйных палажэнняў уносяцца на разгляд Нацыянальнага сходу толькі па прапанове Прэзідэнта або 150 тысяч грамадзян Беларусі, якія валодаюць выбарчым правам. Да выключнай кампетэнцыі Прэзідэнта адносіцца таксама ўнясенне ў Парламент праекта рэспубліканскага бюджэту. Акрамя таго, Канстытуцыя ўстанаўлівае асобы парадак для ўнясення законапраектаў, вынікам прыняцця якіх можа стаць скарачэнне дзяржаўных сродкаў, стварэнне або павелічэнне расходаў. У гэтым выпадку патрабуецца згода Прэзідэнта ці па яго даручэнню Урада.

Рэалізацыя права заканадаўчай ініцыятывы ажыццяўляецца ў Рэспубліцы Беларусь у форме законапраекта. Для ініцыіравання заканадаўчага працэсу суб'ект або суб'екты права заканадаўчай ініцыятывы накіроўваюць праект закона на імя Старшыні Палаты прадстаўнікоў. Законапраекты падлягаюць абавязковай рэгістрацыі і захоўванню ў Сакратарыяце Палаты прадстаўнікоў. Суб'ект права заканадаўчай ініцыятывы мае права адклікаць унесены праект да яго разгляду ў Палаце прадстаўнікоў у другім чытанні.

Да законапраекта прад'яўляецца шэраг патрабаванняў. Праект закона павінен змяшчаць вычарпальную інфармацыю аб мэтах і сутнасці рэгламентуемых адносін, іх суб'ектах, аб'ектах, адпавядаць галіновым прынцыпам пабудовы сістэмы права. Праект закона можа ўключаць інфармацыю аб змесце спецыяльных паняццяў і тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца ў тэксце.

Праекты законаў Рэспублікі Беларусь прадстаўляюцца з прыкладаннем наступных матэрыялаў: суправаджальнага пісьма з указаннем распрацоўшчыкаў законапраекта; абгрунтавання неабходнасці заканадаўчага рэгулявання адносін, якім прысвечаны праекты; пераліку заканадаўчых актаў, якія падлягаюць змяненню, дапаўненню або адмене ў сувязі з прыняццем законапраекта; інфармацыі аб папярэдняй экспертызе законапраекта вучонымі і спецыялістамі або заключэнняў зацікаўленых ведамстваў, прапаноў і заўваг, якія паступілі па законапраекту; фінансавага абгрунтавання законапраекта і інфармацыі аб мяркуемых затратах, звязаных з рэалізацыяй законапраекта.

Папярэдні разгляд законапраектаў

Паступіўшыя праекты законаў і пастаноў накіроўваюцца Старшынёй Палаты прадстаўнікоў адпаведным пастаянным камісіям, іншым органам Палаты прадстаўнікоў для папярэдняга разгляду і вызначэння адпаведнасці законапраектаў прад'яўляемым патрабаванням. Калі прадстаўлены праект або прыкладаемыя матэрыялы не адпавядаюць выкладзеным вышэй патрабаванням, то такі праект на падставе заключэння галаўной камісіі вяртаецца Старшынёй Палаты прадстаўнікоў або яго намеснікам суб'екту права заканадаўчай ініцыятывы, які ўнёс праект, з прапановай выканаць гэтыя патрабаванні. Аднак размова ў дадзеным выпадку ідзе толькі выключна аб фармальна-дакументальным боку пытання. Адмоўнае заключэнне галаўной камісіі па праекту не адмяняе неабходнасці абавязковага разгляду праекта Палатай прадстаўнікоў у аўтарскай рэдакцыі, за выключэннем выпадкаў, калі законапраект не быў адкліканы самім суб'ектам права заканадаўчай ініцыятывы.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў або яго намеснік назначаюць галаўную камісію для папярэдняга разгляду законапраекта і падрыхтоўкі яго да разгляду Палатай прадстаўнікоў. Парадак работы над праектам закона вызначаецца галаўной камісіяй самастойна. Яна накіроўвае законапраект іншым суб'ектам права заканадаўчай ініцыятывы, пастаянным камісіям і Сакратарыяту Палаты прадстаўнікоў, вызначае іншых суб'ектаў, якія прыцягваюцца да папярэдняга разгляду праекта, тэрміны прадстаўлення заўваг і прапаноў. У неабходных выпадках па рашэнню галаўной камісіі законапраекты накіроўваюцца на экспертызу Ураду, розным дзяржаўным і грамадскім органам Рэспублікі Беларусь. Галаўная камісія мае права запатрабаваць у суб'екта права заканадаўчай ініцыятывы, які ўнёс законапраект, любыя неабходныя дадатковыя матэрыялы і інфармацыю.

Работа над законапраектамі ў камісіях праводзіцца галосна, асвятляецца сродкамі масавай інфармацыі. Галаўная камісія мае права прапанаваць правядзенне папярэдняга абмеркавання падрыхтоўваемага праекта ў форме парламенцкіх слуханняў або вынесці яго ва ўстаноўленым парадку на народнае абмеркаванне.

Заўвагі і прапановы, якія паступілі ў працэсе абмеркавання законапраектаў, разглядаюцца на пасяджэннях галаўной камісіі Палаты прадстаўнікоў і ўзгадняюцца з ініцыятарам законапраекта. У законапраект уключаюцца толькі тыя заўвагі і прапановы, па якіх камісіяй дасягнута згода з ініцыятарам законапраекта. Прапановы, па якіх згода не дасягнута, выносяцца на разгляд Палаты прадстаўнікоў. Пасля завяршэння работы над тэкстам законапраекта галаўная камісія накіроўвае сваё заключэнне і законапраект з усімі неабходнымі

матэрыяламі ў Савет Палаты прадстаўнікоў для разгляду пытання аб уключэнні законапраекта ў парадак дня сесіі (пасяджэння) Палаты прадстаўнікоў.

Праект парадку дня, падрыхтаваны Саветам Палаты прадстаўнікоў, разглядаецца і зацвярджаецца Палатай прадстаўнікоў на першых пасяджэннях сесіі. Кожнае пытанне парадку дня сесіі абмяркоўваецца і зацвярджаецца большасцю галасоў ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў. Што датычыцца праекта парадку дня на канкрэтны перыяд пасяджэнняў, то ён абмяркоўваецца і зацвярджаецца ў апошні дзень работы папярэдняга пасяджэння Палаты прадстаўнікоў. Рашэнне прымаецца шляхам галасавання большасцю ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў. У парадку дня павінны быць указаны: час пасяджэння, разглядаемыя пытанні, рэгістрацыйны нумар праекта, кім уносіцца праект, этап разгляду, дакладчыкі і садакладчыкі, якія запрашаюцца для ўдзелу ў пасяджэнні. Унясенне змяненняў і дапаўненняў у парадак дня сесіі або пасяджэння цалкам дапушчальнае, аднак адбываецца гэта толькі па рашэнню Палаты прадстаўнікоў на падставе пісьмовай прапановы Савета Палаты прадстаўнікоў, а таксама суб'ектаў, якія валодаюць правам заканадаўчай ініцыятывы.

Разгляд законапраекта ў першым чытанні

Разгляд праектаў законаў Рэспублікі Беларусь, унесеных у Палату прадстаўнікоў, ажыццяўляецца, як правіла, у двух чытаннях. У ходзе першага чытання Палата прадстаўнікоў заслухоўвае даклад суб'екта права заканадаўчай ініцыятывы, які ўнёс законапраект, і садаклад галаўной камісіі аб асноўных палажэннях законапраекта, паступіўшых прапановах і заўвагах у форме паправак. Спрэчкі пры першым чытанні звычайна не адкрываюцца, хоць такая магчымасць прадугледжваецца па патрабаванню Савета Палаты прадстаўнікоў, пастаяннай камісіі — галаўной па законапраекту або не менш як дзесяці дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Па выніках разгляду Палата прадстаўнікоў галасаваннем адабрае асноўныя палажэнні законапраекта і вызначае тэрмін яго разгляду ў другім чытанні або адхіляе законапраект. Прадугледжваецца таксама магчымасць дапрацоўкі законапраекта і паўторнага яго прадстаўлення на разгляд у першым чытанні.

Часовым рэгламентам Палаты прадстаўнікоў дапускаецца таксама магчымасць прыняцця законапраекта і без другога чытання. Для гэтага Палата прадстаўнікоў павінна прызнаць праект не патрабуючым змяненняў і правесці агульныя спрэчкі. У такіх выпадках галасаванне па праекту ажыццяўляецца паартыкульна, а затым па праекту ў цэлым ці без паартыкульнага галасавання, гэта значыць толькі ў цэлым.

Законапраект, прыняты Палатай прадстаўнікоў у першым чытанні, разглядаецца ў адпаведных органах Палаты прадстаўнікоў з мэтай уліку паступіўшых заўваг і прапаноў. Папраўкі, адхіленыя галаўной камісіяй у ходзе дапрацоўкі законапраекта, прыкладаюцца да тэксту законапраекта для разгляду іх у ходзе другога чытання.

Разгляд законапраекта ў другім чытанні

Пры другім чытанні з дакладам выступае старшыня галаўной камісіі ці кіраўнік органа, які дапрацоўваў праект. Разгляд законапраекта пачынаецца з абмеркавання назвы законапраекта, затым абмяркоўваюцца прэамбула і артыкулы законапраекта. У час абмеркавання магчыма вяртанне асобных частак або законапраекта ў цэлым на дапрацоўку. Галасаванне па кожнай папраўцы праводзіцца ў Палаце прадстаўнікоў асобна. У выпадках, калі ў адзін і той жа артыкул праекта прапанавана ўнесці некалькі паправак, спачатку абмяркоўваюцца і ставяцца на галасаванне тыя з іх, прыняцце або адхіленне якіх дазволіць вырашыць пытанне аб іншых папраўках. Калі папраўкі ўносяцца непасрэдна ў ходзе другога чытання, Старшыня Палаты прадстаўнікоў або яго намеснік маюць права аб'явіць перапынак для падрыхтоўкі заключэнняў па папраўках. Палата прадстаўнікоў заслухоўвае гэтыя заключэнні, і калі дэпутат, які ўнёс папраўку, не згодны з заключэннем камісіі, ён мае права выступіць з абгрунтаваннем сваёй пазіцыі. Але агульныя спрэчкі па папраўках не пачынаюцца. Спачатку праводзіцца галасаванне па папраўцы, унесенай дэпутатам Палаты прадстаўнікоў, затым, калі рашэнне не прынята, — па прапановах камісіі.

На галасаванне ставіцца асобна кожны артыкул ці раздзел або глава праекта закона з унесенымі папраўкамі, а затым увесь праект. Калі па праекту няма ніякіх заўваг і прапаноў, Палата прадстаўнікоў мае права прыняць рашэнне аб галасаванні па законапраекту ў цэлым. У выніку другога чытання Палата прадстаўнікоў прымае праект або адхіляе яго. Па рашэнню Палаты прадстаўнікоў законапраект можа быць прапанаваны да вынясення на рэферэндум (народнае галасаванне).

Асобы парадак разгляду законапраектаў

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь прадугледжвае асобую працэдуру разгляду некаторых законапраектаў. Так, па патрабаванню Прэзідэнта або з яго згоды Урада Палата прадстаўнікоў павінна прымаць рашэнне, галасуючы за ўвесь унесены Прэзідэнтам або Урадам праект або яго частку, захаваўшы толькі тыя

папраўкі, якія прапанаваны Прэзідэнтам ці Урадам, а таксама тыя, з якімі яны згодны. Акрамя таго, у адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 99 Канстытуцыі Прэзідэнт ці па яго даручэнню Урад маюць права ўносіць прапановы ў Палату прадстаўнікоў аб абвяшчэнні разгляду праекта закона тэрміновым. Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі ў гэтым выпадку павінны разгледзець дадзены праект на працягу дзесяці дзён з дня яго ўнясення на разгляд.

Асобы парадак разгляду і прыняцця рашэння прадугледжваецца і для праектаў законаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Па-першае, закон аб змяненні і дапаўненні Канстытуцыі можа быць прыняты пасля двух абмеркаванняў і адабрэнняў Палатай прадстаўнікоў з прамежкам не менш як тры месяцы. Па-другое, раздзелы I, II, IV, VIII Канстытуцыі могуць быць зменены толькі шляхам рэферэндуму. Па-трэцяе, змяненні і дапаўненні не праводзяцца ў перыяд надзвычайнага становішча, а таксама ў апошнія шэсць месяцаў паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў. Па-чацвёртае, спрэчкі па праекту закона аб змяненнях і дапаўненнях Канстытуцыі праводзяцца без абмежаванняў, за выключэннем выпадкаў, калі рашэнне аб спыненні спрэчак прымаецца большасцю галасоў не менш як дзве трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў. Па-пятае, праект Канстытуцыі, праекты законаў аб унясенні ў яе змяненняў і дапаўненняў, аб увядзенні ў дзеянне ўказаных законаў лічацца прынятымі, калі за іх прагаласавала не менш як дзве трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў.

На працягу пяці дзён прыняты законапраект з усімі матэрыяламі перадаецца на разгляд Савета Рэспублікі. Аўтэнтычнасць тэксту законапраекта зацвярджаецца подпісам Старшыні Палаты прадстаўнікоў або яго намесніка.

Разгляд законапраекта ў Савеце Рэспублікі

Прынятыя Палатай прадстаўнікоў законапраекты, як правіла, павінны быць разгледжаны Саветам Рэспублікі ў тэрмін не больш як дваццаць дзён. Паступіўшы законапраект рэгіструецца ў Савеце Рэспублікі і на працягу трох дзён разам з суправаджаючымі яго дакументамі і матэрыяламі накіроўваецца ўсім членам Савета Рэспублікі. Старшыня Савета Рэспублікі вызначае пастаянную камісію Савета Рэспублікі, адказную за разгляд законапраекта, якая дае сваё заключэнне па законапраекту. У заключэнні, якое накіроўваецца на імя Старшыні Савета Рэспублікі, змяшчаецца ацэнка разглядаемага законапраекта і прымаецца адно з наступных рашэнняў:

рэкамендаваць Савету Рэспублікі адобрыць прыняты Палатай прадстаўнікоў законапраект;

рэкамендаваць Савету Рэспублікі адхіліць прыняты Палатай прадстаўнікоў законапраект, выклаўшы ў заключэнні матывы, па якіх пастаянная камісія лічыць неабходным яго адхіліць.

Незалежна ад станоўчага або адмоўнага рашэння камісіі законапраект павінен быць уключаны ў парадак дня сесіі Савета Рэспублікі. Апошні фарміруецца яго Прэзідыумам і зацвярджаецца Саветам Рэспублікі на першым пасяджэнні сесіі.

Разгляд законапраекта на пасяджэнні Савета Рэспублікі пачынаецца з абвяшчэння заключэння пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі, адказнай за разгляд законапраекта, і праекта пастановы Савета Рэспублікі, унесенага пастаяннай камісіяй. Калі адпаведная пастаянная камісія Савета Рэспублікі рэкамендавала адобрыць законапраект, Савет Рэспублікі большасцю галасоў ад поўнага складу Савета Рэспублікі прымае рашэнне правесці галасаванне па адабрэнню праекта без абмеркавання ці рашэнне правесці абмеркаванне законапраекта.

Па выніках разгляду законапраекта старшынствуючы ставіць на галасаванне пытанне аб адабрэнні законапраекта Саветам Рэспублікі. Пастанова Савета Рэспублікі аб адабрэнні законапраекта прымаецца большасцю галасоў ад поўнага складу Савета Рэспублікі. Пастановы Савета Рэспублікі аб адабрэнні праекта Канстытуцыі, законапраектаў аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю, аб увядзенні ў дзеянне ўказаных законаў, актаў аб тлумачэнні Канстытуцыі, а таксама законапраектаў аб асноўных напрамках унутранай і знешняй палітыкі, аб ваеннай дактрыне лічацца прынятымі, калі за іх прагаласавала не менш як дзве трэці ад поўнага складу Савета Рэспублікі.

Рашэнне аб адабрэнні або адхіленні прынятага Палатай прадстаўнікоў законапраекта павінна быць прынята да сканчэння тэрмінаў, прадугледжаных Канстытуцыяй. Калі законапраект не быў разгледжаны Саветам Рэспублікі ва ўстаноўленыя тэрміны, то ён лічыцца адобраным і накіроўваецца Прэзідэнту для падпісання.

Законапраект лічыцца адхіленым, калі за яго адабрэнне не прагаласавала неабходная колькасць членаў Савета Рэспублікі. Рашэнне аб адхіленні законапраекта таксама афармляецца пастановай Савета Рэспублікі. У пастанове аб адхіленні законапраекта можа змяшчацца пералік раздзелаў, глаў, артыкулаў, а таксама частак і пунктаў артыкулаў дадзенага законапраекта, па якіх неабходна пераадолець рознагалоссі паміж Саветам Рэспублікі і Палатай прадстаўнікоў, а таксама прапанова аб стварэнні на парытэтнай аснове пагаджальнай камісіі для выпрацоўкі ўзгодненага тэксту законапраекта. Пастанова Савета Рэспублікі аб адхіленні законапраекта разам з законапраектам ці пастанова Савета Рэспублікі аб адабрэнні законапраекта ў пяцідзённы тэрмін накіроўваюцца ў Палату прадстаўнікоў.

Разгляд законапраекта, адхіленага Саветам Рэспублікі

Пры атрыманні пастановы Савета Рэспублікі аб адхіленні законапраекта, прынятага Палатай прадстаўнікоў, Палата прадстаўнікоў можа:

прыняць законапраект з улікам усіх прапаноў Савета Рэспублікі;

прыняць законапраект з улікам толькі некаторых прапаноў Савета Рэспублікі;

прапанаваць Савету Рэспублікі стварыць на парытэтнай аснове пагаджальную камісію для выпрацоўкі ўзгодненага тэксту законапраекта.

У выпадку, калі Палата прадстаўнікоў прымае рашэнне з улікам усіх заўваг Савета Рэспублікі, адпаведная пастаянная камісія Савета Рэспублікі пацвярджае гэта сваім заключэннем і ўносіць прапанову аб адабрэнні Саветам Рэспублікі прынятага Палатай прадстаўнікоў законапраекта.

Калі пры паўторным абмеркаванні законапраекта, адхіленага Саветам Рэспублікі, Палата прадстаўнікоў прыняла яго ў рэдакцыі, якая ўлічвае толькі частку прапаноў Савета Рэспублікі ці змяшчае выключэнні або новыя палажэнні ў параўнанні з раней прынятай рэдакцыяй, законапраект таксама накіроўваецца ў Савет Рэспублікі.

У выпадку стварэння пагаджальнай камісіі Палата прадстаўнікоў прымае пастанову, у якой указваюцца дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, якія прапануюцца ў склад пагаджальнай камісіі, і яе сустаршыня ад Палаты прадстаўнікоў. Парадак работы і прыняцця рашэнняў пагаджальнай камісіяй вызначаецца сумесным рашэннем абедзвюх палат. Тэкст законапраекта, выпрацаваны пагаджальнай камісіяй, прадстаўляецца на адабрэнне абедзвюх палат.

Калі пагаджальнай камісіяй не прыняты ўзгоднены тэкст законапраекта, Прэзідэнт ці па яго даручэнню Урад могуць запатрабаваць, каб Палата прадстаўнікоў прыняла канчатковае рашэнне. У такім выпадку закон лічыцца прынятым Палатай прадстаўнікоў пры ўмове, што за яго прагаласавала не менш як дзве трэці ад поўнага складу Палаты прадстаўнікоў. Прыняты закон у дзесяцідзённы тэрмін перадаецца на подпіс непасрэдна Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь.

Парадак пераадолення пярэчанняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Закон, прыняты Палатай прадстаўнікоў і адобраны Саветам Рэспублікі, разам з тэкстам пастановы Савета Рэспублікі ў дзесяцідзённы тэрмін прадстаўляецца Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь на подпіс. Калі Прэзідэнт згодны з тэкстам закона, ён яго падпісвае. У выпадку, калі Прэзідэнт не вяртае які-небудзь закон

на працягу двух тыдняў пасля таго, як ён быў яму прадстаўлены, закон лічыцца падпісаным. Закон не можа лічыцца падпісаным і не ўступае ў сілу, калі ён не мог быць вернуты ў Парламент у сувязі з заканчэннем сесіі.

Пры нязгодзе з тэкстам закона Прэзідэнт вяртае яго са сваімі пярэчаннямі ў Палату прадстаўнікоў, якая павінна разгледзець закон з пярэчаннямі Прэзідэнта не пазней як праз трыццаць дзён. Калі закон прымаецца Палатай прадстаўнікоў большасцю не менш як дзве трэці галасоў ад поўнага складу, ён разам з пярэчаннямі Прэзідэнта ў пяцідзённы тэрмін накіроўваецца ў Савет Рэспублікі, які таксама павінен разгледзець яго паўторна не пазней як праз дваццаць дзён. Закон лічыцца прынятым, калі ён адобраны большасцю не менш як дзвюма трацямі галасоў ад поўнага складу Савета Рэспублікі. Закон пасля пераадолення палатамі Парламента пярэчанняў Прэзідэнта падпісваецца Прэзідэнтам у пяцідзённы тэрмін. Закон уступае ў сілу і ў тым выпадку, калі ён не будзе падпісаны Прэзідэнтам у гэты тэрмін.

У такім жа парадку палатамі разглядаюцца пярэчанні Прэзідэнта па асобных палажэннях закона, якія вяртаюцца для паўторнага галасавання. У гэтым выпадку да вынясення адпаведнага рашэння Палатай прадстаўнікоў і Саветам Рэспублікі закон падпісваецца Прэзідэнтам і ўступае ў сілу, за выключэннем тых палажэнняў, адносна якіх ёсць пярэчанні Прэзідэнта.

ПАРЛАМЕНТ — НАЦИОНАЛЬНОЕ СОБРАНИЕ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Структура Парламента, порядок избрания и формирования его палат

Парламент — Национальное собрание Республики Беларусь является двухпалатным представительным и законодательным органом Республики Беларусь.

Палата представителей Национального собрания Республики Беларусь состоит из 110 депутатов, избираемых на основе всеобщего, свободного, равного, прямого избирательного права при тайном голосовании. В соответствии с Конституцией право выдвижения кандидатов в депутаты принадлежит общественным объединениям, трудовым коллективам и гражданам Республики Беларусь. Кандидатом в депутаты Палаты представителей вправе быть гражданин Республики Беларусь, достигший 21 года.

Палата представителей Национального собрания Республики Беларусь была сформирована в ноябре 1996 года из числа депутатов Верховного Совета Республики Беларусь XII созыва, избранных в 1995 году по одномандатным округам с использованием мажоритарной избирательной системы.

